# Аб аб'яднанні грашовых сыстэм Беларусі і Расіі.

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 9/1464(35)

На самай справе рэч ідзе аб уключэнні (інкарпарацыі) грашовай сыстэмы Беларусі у грашовую сыстэму Расіі, або, інакш, Беларусі у склад Расіі. Заява В.Ф.Кебіча: „Мы не адмовімся ад свайго суверэнітэту" разлічана на прастакоў. Калі Беларусь будзе атрымліваць грошы з кішэні Расіі; калі яе армія будзе дыслацыравацца у Беларусі, дыячэ і корміцца на наш кошт; калі ва урадзе і ВС будзе палова расійцаў, як цяпер, а гаспадарамі у нашым доме будуць адчуваць сябе больш за 1,5 мільёна рускіх акупантаў і каланізатараў, настроеных патрыятычна за Расію і супраць усяго беларускага (за рэдкім выключэннем), калі сам Кебіч саромеецца, ці, ня хоча, карыстацца мовай беларускай нацыі — аб ніякай незалежнасці і рэчы быць не можа, колькаб Кебіч не бажыўся, што „мы ад свайго суверэнітэту не адмовімся".

Для такіх „патрыетаў", як Кебіч нічога сьвятога нацыянальнага беларускага няма".

Кожны беларус ведае і добра разумее,

vytoki.net

што з Расіяй нам трэба жыць па-брацку, па-суседску (ды не толькі з Расіяй), але не за кошт здрады сваей дзяржаве і яе народу, што Кебіч называе „выбарам свай жыцця.

Кебіч і Ка паказалі, што спачатку можна зрабіць дзяржаўнае здрадніцтва, ігнаруючы дзяржаве, народу, Канстытуцыі, а потым пад гэта здрадніцтва можна зрабіць у Канстытуцыі папраўку.

Кебіч і Ка - гэта яшчэ не шматпакутная беларуская нацыя, „выбарам жыцця" якой была барацьба за суверэнітэт свайго народа, якія не будавалі, як Кебіч і Ка, за яго кошт для саміх сябе „светлае будучае", а упалі на шыбеніцах, ад куль, голаду, холаду, з якімі расійскія імперыялісты, расісты і бальшэвікі бязлітасна расправіліся, і ня толькі расійскія.

Кебіч і Ка разрабілі, раскралі Беларусь, абяздолілі яе народ, разбурылі эканоміку, грашовую сістэму, дэмаралізавалі народ, выклікалі у краіне хаос, карупцыю, злачыннасць. <u>Таму, усей гэтай кампаніі у галаве з Кебічам неабходна уйсці у адстаўку!</u> Аб'яднанне грашовых сістэм Беларусі і Расіі магчыма толькі на базе здаровых нацыянальных валют!

vytoki.net